# ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ПА РАЗДЗЕЛЕ “СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ”. 5 КЛАС

**Брытанава Сняжана Мікалаеўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Суражская сярэдняя школа
імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова”

***Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам!***

*Урок праводзіцца ў 5 класе пасля вывучэння раздзела “Сінтаксіс і пунктуацыя”. На занятку вучні працуюць навуковымі даследчыкамі, замацоўваюць і сістэматызуюць набытыя веды. Заданні, што выконваюцца на ўроку, садзейнічаюць фарміраванню ўменняў і навыкаў вызначаць галоўныя і даданыя члены сказа, аднародныя члены сказа, просты і складаны сказы. Пяцікласнікі актуалізуюць тэарэтычныя звесткі, а потым прымяняюць набытыя веды на практыцы. Праводзіцца гульня “Трэцяе лішняе”. Мае месца дынамічная (тэматычная паўза). З дапамогай пытанняў падводзяцца вынікі ўрока. У канцы занятку навучэнцы ацэньваюць сваю працу і настрой.*

**Тэма.** Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле “Сінтаксіс і пунктуацыя”.

**Мэта:** да заканчэння ўрока вучні падагульняць і сістэматызуюць веды па асноўных пытаннях раздзела “Сінтаксіс і пунктуацыя”.

**Задачы:**

1) праверыць і выявіць узровень сфарміраванасці ўменняў і навыкаў вызначэння галоўных і даданых членаў сказа, аднародных членаў сказа, простага і складанага сказаў;

2) садзейнічаць развіццю ўмення сканцэнтраваць свае магчымасці ў незнаёмай сітуацыі, умення працаваць у пары, спрыяць развіццю творчых здольнасцей 5-класнікаў;

3) спрыяць выхаванню цікавасці да вывучэння беларускай мовы, пачуцця калектывізму і адказнасці за сумесную працу.

**Абсталяванне:** асабістыя карткі заданняў у вучняў, мультыборд.

**Тып урока:** абагульняючы ўрок.

**Клас:** 5.

**Ход урока**

***I. Арганізацыйна-матывацыйны этап***

*Псіха-эмацыянальны настрой класа*

Весела гучыць званок.
Яго голас нам знаёмы.
Запрашае на ўрок
Беларускай мовы.

— Добрай раніцы, паважаныя вучні! Сядайце! Я рада бачыць вас усіх на ўроку. А каб настрой у нас быў добры, пагуляем у гульню.

*Гульня “Я — асоба”*

Калі вы згодны са сцверджаннем — падымаецеся, не — сядзіце.

1. Я — добры чалавек.
2. Я — разумны вучань.
3. Я — сапраўдны сябар.
4. Я — адказны піянер.
5. Сёння на ўроку Я — надзейны памочнік настаўніцы і аднакласнікам.

***II. Вызначэнне тэмы і мэты ўрока***

На дошцы запісана дата і тэма ўрока, але ў тэме (знарок) не ўказана назва раздзела, па якім будзе праходзіць абагульненне. Настаўнік прапануе вучням разгадаць крыжаванку.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **с** | о | н | ц | а | |
| | с | а | н | к | **і** | | | | | |
| | | | л | ё | **н** | | | | | |
| | | л | і | с | **т** | | | | | |
| б | я | р | о | з | **а** | | | | | |
| в | о | б | л | а | **к** | а | | | | |
| | | | | | **с** | а | б | а | к | а |
| | | | | л | **і** | с | а | | | |
| | | | в | я | **с** | ё | л | к | а | |

Калі разгадаеш крыжаванку, то ў выдзеленым слупку атрымаецца назва раздзела, над якім вучні працавалі не адзін ужо ўрок і будуць працаваць сёння.

1. Не лямпа, а свеціць, не полымя, а грэе? (Сонца)

2. Улетку адпачываюць,
А ўзімку дзяцей катаюць. (Санкі)

3. Урадзіўся ён высокі,
Шаўкавісты, сінявокі.
Апранае нас здавён…
Здагадайцеся, хто ён? (Лён)

4. На мне ты можаш напісаць.
Магу я з дрэва ападаць. (Ліст)

5. Адна я ў лесе з белаю карой.
Багата сокам веснавой парой. (Бяроза)

6. Што без вады плавае? (Воблака)

7. З людзьмі сябруе, хату вартуе,
Жыве пад ганкам, хвост абаранкам. (Сабака)

8. У рыжай разбойніцы хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла — сляды замяла. (Ліса)

9. Каляровае карамысла
Праз рэчку павісла. (Вясёлка)

— А з якой навукай сябруе сінтаксіс? (Пунктуацыя)

Настаўніку трэба дадаць назву раздзела “Сінтаксіс і пунктуацыя”.

*Запіс даты і тэмы ўрока ў сшытак*

Настаўнік просіць вучняў вызначыць задачы ўрока з дапамогай апорных слоў, запісаных на экране (на дошцы прымацавана нагляднасць са словамі “словазлучэнне”, “сказ”, “галоўныя члены сказа”, “даданыя члены сказа”, “простая мова”)

Будзем ведаць…

Будзем умець…

***III. Падагульненне і сістэматызацыя матэрыялу па раздзеле “Сінтаксіс і пунктуацыя”***

***1. Этап актуалізацыі раней вывучанага тэарэтычнага матэрыялу***

— Давайце дамовімся, што сёння на ўроку вы ўсе будзеце маладыя Даследчыкі, а я ваш Кіраўнік. За правільна выкананыя заданні вы будзеце атрымліваць зорачкі, і ў канцы ўрока мы пабачым, хто з вас лепшы Даследчык нашай даследчай установы. Ім стане той вучань, які назбірае найбольшую колькасць зорачак.

Я як Кіраўнік нашай даследчай установы хачу зараз праверыць, ці маеце вы права быць навуковымі Даследчыкамі. І для гэтага прапаную “Лічбавы дыктант”. (Вучні паўтаралі дома тэарэтычны матэрыял па раздзеле “Сінтаксіс і пунктуацыя”)

*Прыём “Лічбавы дыктант”:* калі згодны — 1, не — 0.

1. Сінтаксіс — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца словазлучэнні і сказы. (1)

2. Пунктуацыя — гэта сістэма правілаў правапісу слоў. (0)

3. Словазлучэнне — гэта спалучэнне 2 слоў, звязаных па сэнсе і граматычна. (1)

4. Слова, ад якога ставіцца пытанне, называецца галоўным. (1)

5. Сказы па мэце выказвання падзяляюцца на клічныя і няклічныя. (0)

6. Складаным называецца сказ, у якім 2 і больш граматычных асноў. (1)

7. Дзейнік і выказнік — даданыя члены сказа. (0)

8. Сказы, у якіх, акрамя галоўных членаў сказа, ёсць хоць 1 даданы, называюцца развітымі. (1)

9. Зваротак з’яўляецца членам сказа. (0)

Абмен сшыткамі (узаемаправерка). Вучні ў ролі настаўнікаў. Адказы запісаны на экране.

Калі адказы супадаюць, ставім +, не — –. (падлічыце колькасць плюсаў, выстаўце алоўкам бал за работу)

Адказы:
1 — 1
2 — 0
3 — 1
4 — 1
5 — 0
6 — 1
7 — 0
8 — 1
9 — 0

— Малайцы! Сёння на ўроку вы маеце права быць навуковымі Даследчыкамі. А ці ведаеце вы, што словы “сінтаксіс” і “пунктуацыя” не беларускія, яны прыйшлі да нас з іншых моў. А з якіх моў прыйшлі гэтыя словы і як перакладаюцца на беларускую мову, нам раскажуць юныя навукоўцы-даследчыкі.

(Асобныя вучні мелі ў якасці дамашняга задання даследаваць, з якой мовы паходзяць і як перакладаюцца словы “сінтаксіс” і “пунктуацыя”)

Сінтаксіс (грэч. *syntaxis* — складанне, пабудова).

Пунктуацыя (лац. *punctum* — кропка).

***2. Этап праверкі і выяўлення ўзроўню сфарміраванасці ўменняў і навыкаў па тэме***

— Даследчыкі павінны не толькі ведаць правілы, але і ўмець іх прымяняць на практыцы.

**1.** На дошцы запісаны сказы, неабходна знайсці ў сказах аднародныя члены, расставіць коскі, падкрэсліць аднародныя члены як члены сказа, пабудаваць схемы (па 1 чалавеку ад кожнага рада працуюць ля дошкі, астатнія — у сваіх сшытках)

На стале была свежая выпечка пончыкі булачкі і ватрушкі.

На плошчы ў парку каля тэатра паўсюль гучала музыка.

— Даследчыкі павінны ўмець канструяваць словы, словазлучэнні, сказы. Калі вы зараз правільна выканаеце ўсе заданні, то дакажыце, што вы сапраўдныя пачынаючыя даследчыкі. А я буду кіраваць вашай працай.

**2.** Вучні працуюць у парах.

Неабходна суаднесці схемы сказаў з простай мовай з прапанаванымі сказамі (знакі прыпынку не пастаўлены). Расставіць знакі прыпынку.

| | |
|---|---|
| 1. Бабуля пачакай закрычаў Васіль. | А) "П!" — а. |
| 2. Антон сказаў Сёння пойдзем у тэатр. | Б) "П, — а, — п". |
| 3. Глядзі Пеўнік сказаў Коцік не пускай Лісу ў хатку. | В) А: "П". |

Адказы на экране

1А, 2В, 3Б.

**3.** Заданне выконваецца на слых (слабыя вучні працуюць на картках)

Выпісаць з кожнага сказа граматычную аснову. (у выглядзе табліцы)

| Дзейнікі | Выказнікі |
|---|---|
| | |

А) Сонечныя промні ўжо асвятлялі верхавіны дрэў.

Б) Майская ноч слухала песні салаўя.

В) Дзень і ноч не змаўкае на шашы гул матораў.

Г) Мінск — прыгожы горад.

| Дзейнікі | Выказнікі |
|---|---|
| Промні | асвятлялі |
| Ноч | слухала |
| Гул | не змаўкае |
| Мінск | горад |

Заданне для слабых вучняў (на картках).

Спішыце сказы, падкрэсліце дзейнікі і выказнікі.

Абмытая дажджамі зямля дыміцца. Магутныя сосны задуменна глядзелі ў крыштальнае люстра вады. Пятро выйшаў на дарогу і пакрочыў не спяшаючыся.

*Фізкультхвілінка (тэматычная)*

— Неабходна размеркаваць сказы па мэце выказвання ў адпаведныя слупкі.

Сказы

| | Пытальныя | Апавядальныя | Пабуджальныя |
|---|---|---|---|
| Я чытаю кнігу. | | | |
| Ты пойдзеш у кіно? | | | |
| Беражыце прыроду! | | | |
| Хлопчык малюе машыну. | | | |
| Цікавы сёння ўрок? | | | |

— Даследчыкі павінны ўмець вызначаць не толькі самую важную інфармацыю, але і тое, што лішняе.

**4.** Гульня "Трэцяе лішняе"

1. Апавядальны, пытальны, клічны.
2. Развіты, просты, неразвіты.
3. Дапаўненне, дзейнік, выказнік.

— Канечне, важнай рысай людзей, што займаюцца даследчай дзейнасцю, з'яўляецца творчасць.

— Зараз вы павінны паказаць, наколькі вы творчыя вучні. І ўмееце даследаваць структуру сказа (просты ці складаны сказ, развіты ці неразвіты сказ).

Замест кропак устаўце неабходныя па рыфме словы. Назваць звароткі ў вершы. У трэцім сказе вызначыць 2 словазлучэнні. Які трэці сказ, просты ці складаны, развіты ці неразвіты?

Вось вам, вучні, верш зімовы.
Дапішыце ў вершы словы.
Зімой даліны і сцяжынкі
пакрылі белыя ....................... .
Як шэры воўк, завыла глуха
ў полі злая ....................... .
Галодныя — без ежы птушкі.
Сябры! Зрабіце ім .......................

***IV. Кантрольна-рэфлексійны этап***

Тэставая работа па тэме "Сінтаксіс і пунктуацыя"

1. *Якое спалучэнне слоў не з'яўляецца словазлучэннем?*

а) дапамога доктара б) аказаць дапамогу в) доктар дапамог.

2. Адзначце пабуджальны сказ (знакі прыпынку ў канцы сказа не пастаўлены):

а) Пад нагамі шамаціць рознакаляровае лісце б) Палюбуемся гэтай прыгажосцю в) Чуецца курлыканне жураваў

3. Адзначце неразвіты сказ:

а) Пайшоў снег. б) Прыйшла вясёлая і шумлівая вясна. в) На дарогах гамоняць ручайкі.

4. Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

Беларусь — мая **Радзіма**.

а) дзейнік; б) выказнік; в) дапаўненне.

5. Адзначце сказ са зваротkам (знакі прыпынку не пастаўлены):

а) Цёплы дожджык не прагнаў дзяцей з вуліцы. б) Я думаў пра цёплы дожджык, якога так не хапала. в) Ці любіш ты дружа цёплы дожджык?

Ключы да тэста:

1-в

2-б

3-а

4-б

5-в

***V. Падвядзенне вынікаў. Выстаўленне адзнак.***

Настаўнік прапануе вучням пытанне:

— Тэмы якога раздзела мы сёння паўтарылі?

— Што такое сінтаксіс? пунктуацыя?

— У пачатку ўрока мы вызначалі, што будзем ведаць і ўмець. Давайце ў канцы ўрока звернемся да таго, што ж мы ведаем і ўмеем.

— Ці спадабалася вам рабіць даследаванні на ўроку? Хто ж з вас стаў лепшым даследчыкам нашай даследчай установы. Палічыце колькасць сваіх зорачак і па чарзе агучце.

(Адзнакі выстаўляюцца з улікам лічбавага дыктанта на пачатку ўрока, а таксама ўлічваецца, як вучань працаваў на працягу ўсяго ўрока).

Настаўнік разам з вучнямі каменціруе адзнакі, пачынаючы выстаўленне адзнак словамі, якія запісаны на экране.

Я паставіла б … адзнаку…,бо…

***VI. Рэфлексія.***

— Ацаніце ваш настрой на ўроку ў балах (ад 1 да 10). Чым вышэй ваш настрой, тым вышэй і бал, выберыце сэрца такога колеру, які вам падабаецца, пастаўце бал у сэрцы і прымацуйце сэрца да дошкі.

***VII. Дамашняе заданне.***

Пр. 228 на с. 140. Выпісаць з тэксту сказы з простай мовай, скласці схемы.

На 10 б. Пр. 229 на с. 141. Прыдумаць канец апавядання, выкарыстоўваючы словы для даведкі.